4. *Сильная* и процветающая Беларусь должна иметь прочный идеологический фундамент: доклад Президента А.Г.Лукашенко на постоянно действующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам совершенствования идеологической работы // Советская Беларусь. – 2003. – 28 марта.

**І.М.Стрыжонак,** *дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА “БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА. ТЭОРЫЯ”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пытанні самасвядомасці цікавяць філосафаў, псіхолагаў, педагогаў, сацыёлагаў. Яны знайшлі адлюстраванне яшчэ ў працах Сакрата, Арыстоцеля, пазней – у працах Ж.-Ж.Русо, Л.Талстога, Э.Фрэнэ.

Пытанні фарміравання самасвядомасці разглядаюцца і ў працах сучасных вучоных. Так, работа А.Г.Спіркіна “Свядомасць і самасвядомасць” прысвечана раскрыццю асобаснага аспекту самасвядомасці, вучоны разглядае яе як адлюстраванае і ўсвядомленае быццё. У кнізе В.В.Століна “Самасвядомасць асобы” вылучаюцца ўзроўні і адзінкі самасвядомасці. Л.С.Выгоцкі ў сваіх работах падкрэслівае кіруючую ролю навучальных устаноў у выхаванні і навучанні, фарміраванні асобы, у тым ліку і ў фарміраванні самасвядомасці [1]. Беларускі псіхолаг М.А.Крэмень, псіхолаг Л.А.Пергаменшчык і іншыя вучоныя ў сваіх працах канцэнтруюць увагу на філасофска-метадалагічных і гістарычна-культурных аспектах самасвядомасці [2, 3].

Аналіз прац дазваляе зрабіць выснову, што ў фарміраванні самасвядомасці грамадзяніна-беларуса неабходна ўлічваць чатыры асноўныя падструктуры, уласцівыя любому чалавеку. Першую складаюць інтарэсы асобы, у тым ліку і яе светапогляд.

Другая падструктура, звязаная з вопытам, уключае веды, уменні і навыкі. Трэцюю падструктуру асобы складаюць індывідуальныя асаблівасці розных псіхічных працэсаў, якія па сваёй сутнасці з'яўляюцца формай адлюстравання свету. І, нарэшце, у чацвёртую падструктуру ўваходзяць у асноўным біялагічна абумоўленыя якасці асобы, якія называюцца тэмпераментам. Веданне і ўлік падструктур асобы дазваляе выкладчыку абапірацца на іх у выхаванні самасвядомасці студэнтаў. Важнае месца тут займаюць сам працэс пазнання і тое, як ён будуецца ў навучальна-выхаваўчай рабоце. Устаноўлена, што асноўны закон засвойвання ведаў праяўляецца ў наступнай схеме: успрыняць – асэнсаваць – запомніць – прымяніць – праверыць вынік. У гэтым ланцугу ўсе працэсы звязаны і ўзаемаабумоўлены. Успрыманне суправаджаецца разуменнем, разуменне – запамінаннем.

К.К.Платонаў і Г.Г.Голубеў разглядаюць свядомасць як складаную форму адлюстравання, якая характарызуецца тым, што чалавек вылучае сябе з навакольнага свету, адрознівае сябе ад рэчаў, жывёл і ўсведамляе свае адносіны да прыроды і людзей [1].

Паняцце нацыянальнай самасвядомасці характарызуе пераважна рысы, уласцівыя супольнасцям, у тым ліку этнасу і грамадству. Гэтая катэгорыя ўключае ідэалы, светапогляд, менталітэт; асэнсаванне і ацэнку адносін да сваёй нацыі, пачуццё прыналежнасці да гісторыі, традыцый свайго народа, выразную ідэнтыфікацыю сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца вынікам сацыялізацыі чалавека. Нацыянальная самасвядомасць моладзі фарміруецца пад уплывам усёй сістэмы грамадскіх адносін і залежыць ад сацыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця грамадства. Галоўнымі сродкамі росту нацыянальнай самасвядомасці з'яўляюцца ўсеагульная адукаванасць і павышэнне яе ўзроўню. Таму планаванне вучэбна-выхаваўчага працэсу і яго арганізацыя ва універсітэце павінны дапамагаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў. Аб актуальнасці гэтай праблемы сведчыць артыкул 4 Закона аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

На працягу ўсіх гадоў навучання ў БДУ культуры і мастацтваў у студэнтаў выхоўваюцца нацыянальныя пачуцці, імі засвойваюцца культура і традыцыі роднага народа. Нацыянальная самасвядомасць знаходзіць адлюстраванне перш за ўсё ў адносінах да роднай мовы. У мове ўгрымліваюцца тыя элементы, якія злучаюць нас з продкамі, з гісторыяй развіцця краіны, з будучыняй і нашчадкамі.

З 1992/93 навучальнага года курс "Бібліятэказнаўства. Тэорыя", як і шэраг іншых спецыяльных дысцыплін, выкладаецца на беларускай мове, напоўнены нацыянальным зместам. Так, у лекцыях і на семінарскіх занятках пры вывучэнні бібліятэчнай справы як галіны дзейнасці яе сутнасна-функцыянальная структура разглядаецца на прыкладзе бібліятэчнай справы Беларусі; аналізуюцца асноўныя прынцыпы яе арганізацыі; шляхі рацыянальнага размяшчэння сетак бібліятэк краіны з улікам развіцця ў асобных рэгіёнах галін вытворчасці, а таксама пытанні ўзаемадзеяння і ўзаемавыкарыстання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь з мэтай найбольш поўнага задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў.

Фарміраванню ў студэнтаў пачуцця нацыянальнай годнасці і самасвядомасці садзейнічае выкладанне матэрыялу па тэме "Бібліятэчныя сеткі і сістэмы", дзе даецца агульная характарыстыка сістэмы бібліятэк Беларусі, разглядаюцца заканамернасці фарміравання бібліятэчных сетак краіны, аналізуецца іх структура і вызначаюцца асноўныя кірункі дзейнасці бібліятэк, у тым ліку і дзейнасць па адраджэнні і развіцці нацыянальнай культуры.

Нацыянальная накіраванасць выкладання курса "Бібліятэказнаўства. Тэорыя" характарызуе і заняткі па тэмах "Знешняе асяроддзе бібліятэк", "Бібліятэчная адукацыя", "Кіраванне бібліятэчнай справай". Носьбітам нацыянальнай сама-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свядомасці выступае ўся нацыянальная супольнасць, у тым ліку і студэнцкая моладзь. Вынікі сацыялагічнага даследавання, якое праводзіла навукова-даследчая група кафедры сацыялогіі БДУ па вывучэнні ўмоў фарміравання нацыянальнай самасвядомасці студэнцкай моладзі, сведчыць аб тым, што на ўзровень нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў уплываюць такія фактары, як веданне гісторыі свайго народа, сваёй дзяржавы, нацыянальнай мовы, эканамічная самастойнасць, палітычны суверэнітэт, развіццё культуры.

Знаёмства з асновамі арганізацыі бібліятэчнай справы Беларусі, з дзейнасцю бібліятэк, накіраванай на захаванне і распаўсюджванне духоўных здабыткаў беларускага народа, садзейнічае фарміраванню пэўнага светапогляду студэнтаў, іх самасвядомасці. Нацыянальная самасвядомасць гэта не толькі веданне мовы, гісторыі, культуры свайго народа, але і пэўнае разуменне яго нацыянальных інтарэсаў. Мы павінны так выкладаць матэрыял, каб студэнты часцей ставілі пытанні: «Куды мы ідзем? Якую краіну будуем? Як будзе развівацца бібліятэчная справа краіны?» Менавіта ў працэсе прафесійнай адукацыі студэнцкая моладзь павінна зразумець, што яна не толькі носьбіт вызначанай культуры, але і носьбіт нацыянальнай самасвядомасці свайго народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Альшэўская Н.У.* Грамадзянская самасвядомасць: думкі і меркаванні // Адукацыя і выхаванне. – 1998. – №10. – С.3–10.

2. *Крэмень М.А.* Самакіраванне ў адукацыі // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – №12. – С.72–82.

3. *Пергаменщик Л.А.* Самосознание личности. Методологические и прикладные проблемы. – Мн.: Нац. ин-т образования, 1993. – 40 с.